Vol. VIII of X

V FOR VENDETTA™

By Alan Moore and David Lloyd



FEB 89
$2.00 US
$2.50 CAN

Suggested For Mature Readers

BY COMICS
V ЗНАЧЫЦЬ ВЕНДЭТА #8 (1988)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY

V FOR VENDETTA™

By **Alan Moore** and **David Lloyd**

Color artists:
Steve Whitaker
Siobhan Dodds
David Lloyd

Lettering:
Steve Craddock

Additional art for
"Valerie" in Vol. VI and
"Vincent" in Vol. VII
by **Tony Weare**



V FOR VENDETTA 8
Published monthly by DC Comics Inc.,
666 Fifth Avenue, New York, N.Y. 10103.
© 1988 DC Comics Inc. All Rights Reserved.
The stories, characters and incidents
mentioned in this magazine are entirely fictional.
All characters featured in this issue
and the distinctive likenesses thereof
are trademarks of DC Comics Inc.
Printed in Canada.

DC Comics Inc.
A Warner Communications Company.

5 ЛІСТАПАДА 1998 ГОДА. УХА.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МІСТАР ЭТЭРЫДЖ. СПАЗНІЛІСЯ?

СКАЖЫЦЕ, ВЫ СЁННЯ БАЧЫЛІ МІСТАРА ФІНЧА?

НЕ, ЭЭЭ, ДАМІНІК.

НЕ БАЧЫЎ ЭРЫКА З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК ЁН... Э-Э... АБЕДАЎ СА МНОЙ І МІСІС ЭТЭРЫДЖ У МІНУЛЫ АЎТОРАК.

НІЧОГА... Э-Э.. НЕ ЗДАРЫЛАСЯ, СПАДЗЯЮСЯ?

НЕ, НІЧОГА СУР'ЁЗНАГА.

У ВОГУЛЕ ДРОБЯЗІ... ТЭЛЕЛІ З ФАРМАЦЭЎТЫЧНАГА, СКАЗАЛІ, ШТО ДЗЕСЬЦІ СТРАЦІЛІ ВЕДАМАСЦЬ НА ТАКСІЧНЫЯ РЭЧЫВЫ, ЯКІЯ ЁН ЗАМОВІЎ ПАРУ МЕСЯЦАЎ НАЗАД.

ЯНЫ ХАЦЕЛІ ПРАВЕРЫЦЬ, ШТО ЁН ТАДЫ БРАЎ. А Я НЕ МАГУ ЯГО ЗНАЙСЦІ.

Я Б НЕ ХВАЛЯВАЎСЯ, АЛЕ... ГЭТА НА ЯГО НЕ ПАДОБНА.

ЁН БЫЎ НЕЯК ПАДУШАНЫ Ў АПОШНІ ЧАС. З-ЗА ТАГО ТЭРАРЫСТА. УВЕСЬ ЧАС СЯДЗІЦЬ І ЧЫТАЕ. ПРЫЧЫМ Я ПРА ТАКОГА ПІСЬМЕННІКА І НЕ ЧУЎ НІКОЛІ.

НЕЙКІ КЕСТЛЕР.

ГЭТА, НАПЭЎНА... Э-Э... АРТУР КЕСТЛЕР.

ЁН УЗНАЧАЛЬВАЎ... Э-Э... РУХ ПАД НАЗВАЙ «УХОД». ЯНЫ ДЭКЛАРЫРАВАЛІ, ШТО КОЖНЫ ЧАЛАВЕК МАЕ ПРАВА ПАМЕРЦІ ГОДНАЙ СМЕРЦЮ.

ЁН... Э-Э... ТОЙ, ЗДАЕЦЦА, ПАКОНЧЫЎ З САБОЙ.

НУ, Э-Э... А ЯК ПРАСОЎВАЕЦЦА СПРАВА ТЭРАРЫСТА?

А-А, ГЭТА... НУ... НАПАЧАТКУ ГОДА БЫЛІ ПРАБЛЕМЫ, АЛЕ З ТЫХ ЧАСОЎ...

МЁРТВАЯ ЦІШЫНЯ.

КНІГА 3

КРАІНА РАБІ-ЯК-ПАЖАДАЕШ

„1812"
Ouverture Solennelle

ПРАЛОГ


V? Я ТУТ НЕКАТОРЫЯ РЭЧЫ З ТВАЙГО ПАКОЯ ПРЫНЕСЛА.
ЯНЫ МНЕ БОЛЬШ НЕ ПАТРЭБНЫ.


ВЯСЕННЯЕ ПРЫБІРАННЕ, ІВІ? У ЛІСТАПАДЗЕ?
НЕ... ПРОСТА ЗАХАЦЕЛАСЯ ВЫКІНУЦЬ УСЁ, У ЧЫМ НЯМА НЕАБХОДНАСЦІ.
З ТАБОЙ КАЛІ-НЕБУДЗЬ ТАКОЕ БЫЛО?


О, ТАК.
І ШМАТ РАЗОЎ.




V?
ТАК?


НЕШТА АДБЫВАЕЦЦА, ТАК? ТЫ ШТОСЬЦІ РЫХТУЕШ.
НЕ ТУРБУЙСЯ, ІВІ. БО ВЕДАЕШ, ЯК КАЖУЦЬ...
«УСЁ СКОНЧЫЦЦА НА КАЛЯДЫ».


ФІНАЛ БЛІЖЭЙ, ЧЫМ ТЫ ЛІЧЫШ. І ЁН УЖО НАПІСАНЫ.
ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ ВЫБРАЦЬ ВЫДАТНЫ МОМАНТ, КАБ ПАЧАЦЬ.



ЛЁС.

ДЗІЎНЫ ЛЁС.

ДАЛЁКІ ЛЁС.

БЯЗЛІТАСНЫ ЛЁС.

КАЖУЦЬ, НЕЛЬГА СФАРМУЛІРАВАЦЬ ПЫТАННЕ, НА ЯКОЕ ТЫ Б НЕ МАГЛА АДКАЗАЦЬ.

ТАДЫ СКАЖЫ МНЕ ВОСЬ ШТО...

ЦІ ЛЮБЯЦЬ МЯНЕ?

НЯХАЙ НЕ БАЯЦЦА.

НЯХАЙ НЕ ПАВАЖАЮЦЬ.

АЛЕ – ЦІ ЛЮБЯЦЬ?

ТЫ СКАЗАЎ: «Я ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ». Я САМ БАЧЫЎ.

КАЛІ ТОЛЬКІ ГЭТА НЕ БЫЎ ЗБОЙ У СЕТЦЫ, КАЛІ ГЭТА НЕ БЫЎ ПАДМАН ЗРОКУ, КАЛІ Я НЕ СЫХОДЖУ З ГЛУЗДУ.

КАЛІ ЛАСКА...

КАЛІ ЛАСКА, ДАЙ МНЕ ЗНАК.






БОЖА...
ВЫ... ВЫ СА СЛУЖБЫ ФІНЧА?


ШТО ЗДАРЫЛАСЯ? МЫ ТОЛЬКІ ШТО ПРЫБЫЛІ, І РАПТАМ ВЫБУХ...


МІСТАР ХЭЙЕР?
БОМБА... Я Ў ТОЙ МОМАНТ... ВЫХОДЗІЎ З БУДЫНКУ...
МІСТАР ЭТЭРЫДЖ, СЭР... ЁН ЗАТРЫМАЎСЯ СЁННЯ...


ЭТЭРЫДЖ? І ШТО, ЁН ПАРАНЕНЫ?
ЁН, МЁРТВЫ, СЭР.
БОЖА, МЯНЕ ЗАРАЗ ЗВАНТУЕ.


ОХ.
КОНРАД, ШТО АДБЫВАЕЦЦА? ТЫ ПРОСТА ЗБЕГ І КІНУЎ МЯНЕ.
Г-ГЭТА БЫЛА БОМБА... ВЕЖА...


ВУХА І ВОКА ПАШКОЖДАНЫЯ. Я ПАВІНЕН ТЭРМІНОВА ПАВЕДАМІЦЬ ЛІДАРУ...
ПАЛОВА ГОРАДА ЧУЛА ГРУКАТ. РОТУ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗРАБІЦЬ ПАВЕДАМЛЕННЕ...


ЧАРГОВЫ «ЗАПЛАНАВАНЫ ЗНОС»? ДЫ ХТО ПАВЕРЫЦЬ ПАСЛЯ ПАРЛАМНЕТА І ОЛД БЭЙЛІ? ШТО ЯНЫ МОГУЦЬ ЯШЧЭ СКАЗАЦЬ?
НЯ ВЕДАЮ, ШТОНЕБУДЗЬ.
У ТАКІЯ МОМАНТЫ ШТО ЗАЎГОДНА ЛЕПШ, ЧЫМ МАЎЧАННЕ.





ЛІДАР, МІСТАР КРЫДЗІ НА ДРУГІМ ЭКРАНЕ, МІСТАР ХЭЙЕР НА ЧАЦЬВЁРТЫМ.
ГЭТА НЕАДКЛАДНА?

Я... Э-Э... ПРАБАЧЦЕ, ЛІДАР?

НЕ, НІЧОГА.
УКЛЮЧЫЦЕ КРЫДЗІ, ХЭЙЕР НЯХАЙ ПАЧАКАЕ.

ЛІДАР...
ДЖОРДАН-ТАЎЭР... ЁН ЯЕ ПАДАРВАЎ.
І СТАРУЮ ВЕЖУ ПАШТАМТА ТАКСАМА. ВОКА І ВУХА ВЫВЕДЗЕНЫ З ЛАДУ.

МЫ АСЛЕПЛІ, АГЛУХЛІ І ЗДРАНЦВЕЛІ...
ЗАРАЗ ЖА ВЫВОДЗЬЦЕ НА ВУЛІЦЫ ПЕРАСОЎНЫЯ ПЕРАДАТЧЫКІ.
ПАНІКІ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА, НАВАТ КАЛІ МЫ НЕ ЗМОЖАМ ТЭРМІНОВА СУПАКОІЦЬ ЛЮДЗЕЙ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ТРАНСЛЯЦЫЙ.

ТОЛЬКІ ВОСЬ ШТО, ЛІДАР... ХОЦЬ МЫ НЕ ЗМОЖАМ ПАЧАЦЬ ВЯШЧАННЕ ЗАРАЗ ЖА...
АЛЕ ХТОСЬЦІ ІНШЫ ЎЖО ПАЧАЎ.
ПАСЛУХАЙЦЕ.


ДОБРЫ ВЕЧАР, ЛОНДАН.
СЛУХАЙЦЕ «ВЕСНІК ЛЁСУ».



АМАЛЬ ЧАТЫРЫСТА ГАДОЎ НАЗАД У ТАКУЮ Ж НОЧ ВЯЛІКІ ГРАМАДЗЯНІН ЗАКЛАЎ ВЕЛЬМІ ВАЖНУЮ ДЛЯ НАШАЙ КУЛЬТУРЫ ТРАДЫЦЫЮ.



ГЭТА ТРАДЫЦЫЯ БЫЛА ЗАКЛАДЗЕНА Ў СТРАЖЭЙШАЙ ТАЯМНІЦЫ, У ЦІШЫНІ, У ЦІХУЮ НОЧ, ХОЦЬ У ГОНАР ЯЕ ПРЫНЯТА ШУМЕЦЬ І ЗАПАЛЬВАЦЬ АГНІ.


У ГОНАР АБ ТЫМ СЛАВУТЫМ ВЕЧАРЫ ЎРАД ЯЕ ВЯЛІКАСЦІ З РАДАСЦЮ ВЯРТАЕ ВАМ, СВАІМ АДДАНЫМ ГРАМАДЗЯНІНАМ, ПРАВА НА ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ.


ТРЫ ДНЯ ЗА ВАМІ НІХТО НЕ БУДЗЕ НАЗІРАЦЬ.


ВАШЫ РАЗМОВЫ НЕ БУДУЦЬ ПРАСЛУХОЎВАЦЦА.


І АДЗІНЫМ ЗАКОНАМ ДЛЯ ВАС БУДЗЕ ЗАКОН «РАБІЦЕ, ШТО ХАЦІЦЕ».
БОЖА, ШАНУЙ ВАС.
І ДАБРАНАЧ.


КАНЕЦ ПРАЛОГУ.






6 ЛІСТАПАДА 1998 ГОДА.
МАНІТОРЫ ПАШКОДЖАНЫЯ. ЗАСТАВАЙЦЕСЯ Ў ДАМАХ




НЕ БУДЗЕ ТЭЛЕКА?
ШТО, І РАДЫЁ ТАКСАМА? ЧОРТ, НУ ГЭТА ЎЖО АПОШНЯЯ КРОПЛЯ! Я ТУТ ПЛАЧУ ІМ ЗА ЛІЦЭНЗІЮ, А ЯНЫ...
ПАЧАКАЙ-КА, КАЖАШ, ВЕЖУ ПАЧТАМТА ТАКСАМА ЗРУЙНАВАЛІ? ДЫК ЯНЫ ШТО, ЦЯПЕР БОЛЬШ НЕ МОГУЦЬ...


ДА ЗАДНІЦЫ...




...І ЯНА КАЖА, МІКРАФОНЫ НІ ВОДНЫ НЕ ПРАЦУЕ...
...А Я-ТА ТАК ЗВЫКНУЎСЯ ДА ГЭТЫХ КАМЕР, ЯК ЯНЫ ТУДЫ-СЮДЫ ВАРОЧА-ЮЦЦА...
...І ГЭТА ЯНЫ ЗАВУЦЬ ПРАГРЭСАМ, ХЕХЕ.






ДЫК ВОСЬ, ПАЧУЛІ, ШТО КАМЕРЫ ВЫКЛЮЧАНЫЯ, І ПАЙШЛІ ДАДОМУ, ТУТ ЁН МНЕ І КАЖА, ПАКОЛЬКІ НАС НІХТО НЕ БАЧЫЦЬ, ЯК НАКОНТ?..
ВОСЬ НАБРЫДЗЬ! ДУМАЕ, МОЖНА РАБІЦЬ, ШТО ЗАЎГОДНА.
З ІНШАГА БОКУ, НАПЭЎНА...


ДА ЗАДНІЦЫ...


ХА-ХА!
FOR YOUR PROTECTION


ДА ЗАДНІЦЫ МІСТАРА СЬЮЗЭНА, ДА ЗАДНІЦЫ ЛЁС...
ДА ЗАДНІЦЫ НАШАГА ТАТУЛЮ. ДА ЗАДНІЦЫ МІС ПЛАТ СА ШКОЛЫ...
ДА ЗАДНІЦЫ, ДА ЗАДНІЦЫ, ДА ЗАДНІЦЫ!



ТЭРАРЫСТ, ЯКІ ГЭТА ЗРАБІЎ, – НЯГОДНІК, АЛЕ РАЗУМНЫ. ЯК КАЖУЦЬ, «ЗЛЫ ГЕНІЙ».
ІМЯ Б ЯМУ АДПАВЕДНАЕ. «ПАНТЭРА», «ЛІСА», «ПАТРАШЫЦЕЛЬ» – ВОСЬ ГЭТА СПРАВА. А ТО ЛІТАРЫ НЕЙКІЯ.
ВОСЬ ЯМУ Б ГЭТА І СКАЗАЎ...








ЁН ЗАБРАЎ ЯГО.
ЗАБРАЎ ГОЛАС ЛЁСУ. ЧЫМ Я ЗАПОЎНЮ ПУСТЭЧУ?
ЯК МАЯ КРАІНА ВЫТРЫМАЕ ЦІШЫНЮ?


ГЛАВА І
VOX POPULI




НУ ШТО Ж, ПАКУЛЬ ЛЮДЗІ НЕ АСАБЛІВА ХВА-ЛЮЮЦЦА, ЛІДАР.
УСЁ ЦІХА... ХОЦЬ ПАКУЛЬ ЯШЧЭ РАНА КАЗАЦЬ. ПАДМАЦАВАН-НЕ БЫ НАМ НЕ ПЕРАШКОДЗІЛА, ПРОСТА НА ЎСЯКІЙ ВЫПАДАК.


ПРАБЛЕМА Ў ТЫМ, ШТО З-ЗА ПАХАВАННЯ БОНІ... ПРАБАЧЦЕ, МІСТАРА ЭТЭРЫДЖА, МНОГІЯ АФІЦЭРЫ ПРОСЯЦЦА Ў АДГУЛ.
МНЕ БЫ ВЕЛЬМІ НЕ ХАЦЕЛАСЯ Б АДПУШЧАЦЬ ІХ, АЛЕ, З ІНШАГА БОКУ, КАЛІ НІХТО НЕ ПРЫЙДЗЕ, МІСІС ЭТЭРЫДЖ АБРАЗІЦЦА...


А ДРУГАЯ ПРАБЛЕМА - ГЭТА МІСТАР ФІНЧ. ЁН ВЯДЗЕ СЯБЕ ДЗІЎНА. ЯГО НЯМА ЎЖО ДВА ДНІ. Я НЕ КРЫТЫ-КУЮ, ЛІДАР, АЛЕ МАБЫЦЬ ЁН, ПА-ЛЕЦ УЗНАЧАЛІЦЬ...
Я ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ.
...ХТО-НЕБУДЗЬ МАЛАДЗЕЙШЫ...





Я...
ПРАБАЧЦЕ, ЛІДАР...
В-ВЫ ШТОСЬЦІ СКАЗАЛІ?


НЕ-НЕ, НІЧОГА.
ДАШЛІЦЕ МІСІС ЭТЭРЫДЖ КВЕТКІ І МАЕ ВЫБАЧЭННІ. ВЫКЛІЧЦЕ НА СЛУЖБУ ЎСІХ АФІЦЭРАЎ, ПАДВОЙЦЕ ПАТРУЛІ НА ВУЛІЦАХ.
І ЯШЧЭ... МАРАДЗЁРАЎ РАСТРЭЛЬ-ВАЦЬ НА МЕСЦАХ.



ГЭТА ЎСЁ, МІСТАР КРЫДЗІ.
АНГЛІЯ НАЙВЫШЭЙ УСЯГО.


SUPERSAVERS
PEAS
JAM 30p


ХММ, ДЫК ШТО НАКОНТ САСІСАК?
НЕ, НУ Я, У СЭНСЕ, ВЕРУ Ў ЗАКОН І ПАРАДАК, АЛЕ ЧОРНЫ РЫНАК ЦІ НЕ, КАЛІ Я НЕ СКАРЫСТАЮСЯ ПРАПАНОВАЙ, ЁЮ СКАРЫСТАЕЦЦА ХТО-НЕБУДЗЬ ІНШЫ...
ПЕРАДАСІ МНЕ КЕТЧУП, ГА?


SUPERSAVERS
PEAS


...У СВАІХ ДАМАХ І ЗАХОЎВАЙЦЕ СУПАКОЙ. НІЧОГА НЕ АДБЫВАЕЦЦА.
СІТУАЦЫЯ ПАД КАНТРОЛЕМ, МЫ ДАЕМ ПАРАДУ ГРАМАДЗЯНАМ ЗАЙМАЦЦА СВАІМІ СПРАВАМІ, ЯК ЗВЫЧАЙНА.
ПАЎТАРАЮ...


SUPERSAVERS
JAM 30p


ДЗЕНЬ ДОБРЫ.
Я Б ЖАДАЛА НАБЫЦЬ ПІСТАЛЕТ.

НУ НІ ЧОГА САБЕ? НЕ, ШО, САПРАЎДЫ ХОЧАШ СТВОЛ НАБЫЦЬ?

НЕ, НУ Я НЕ ЗРАЗУМЕЎ, ТЫ ШО ДА МЯНЕ-ТА ПРЫШКАНДЫБАЛА, Я НАОГУЛ БЫЦЦАМ ПІВА ТУТ ВЫПІЦЬ САБРАЎСЯ, ТЫ ШО? МІМА КАСЫ КАНКРЭТНА, РАЗУМЕЕШ?

У М-МЯНЕ ЁСЦЬ ГРОШЫ. Я ЧУЛА, ШТО Ў ВАС МОЖНА ПАСПЫТАЦЬ, ТЫМ БОЛЬШ МАНІТОРЫ ВЫКЛЮЧАНЫЯ.

НЕ, НУ МОЖ І ТАК, ТОЛЬКІ ШО-ТА Я Ў СУМНЕВУ. НЕ ТАГО ТЫ ТЫПУ ПТУШКА, ЗРАЗУМЕЛА? КАГО МАЧЫЦЬ-ТА ЗАЗБІРАЛАСЯ, ГА?

НІКОГА!

Я... МНЕ ПРОСТА ПАТРЭБНА АБАРОНА... ЗАРАЗ ЖА ТАКОЕ ДЗЕЕЦЦА...

НЕ, ШО ТАБЕ САПРАЎДЫ ТРЭБА, ДЫК ГЭТА НАРМАЛЁВЫ КЕНТ. НЕЧА КІСКАМ З ГАРМАТАМІ БАЛАВАЦЦА, ЗРАЗУМЕЛА? У ГЭТАЙ СПРАВЕ БАБЫ НЕ КАНАЮЦЬ.

У МЯНЕ ЧАТЫРЫСТА ФУНТАЎ.

Я МАГУ ЗАПЛАЦІЦЬ ПАЛОВУ ЗАРАЗ, А АСТАТНІЯ, КАЛІ...

Ш-Ш, ДЫ НЕ ГАМАНІ ТЫ, ДЗЕЛЯ ХРЫСТА.

ЧАТЫРЫ СОТНІ, ТАК? ТЫПУ КІСЦЫ КІПЦЮРЫКІ?

ТАК.

НЕ, НУ ДОБРА, СУСТРЭНЕМСЯ ЗА КУТАМ, КАЛІ КРАМКА ЗАЧЫНЕЦЦА. ПАБАЧЫМ, ШО ТУТ МОЖНА ПРЫДУМАЦЬ.

І ЛЕПШ, КАБ ТЫ ЎЯЎЛЯЛА, ШТО РОБІШ, КІСКА, АГА?

ГЭТА ТАБЕ НЕ ЦАЦКА, УЦЯМІЛА, НУ? ГЭТА БАХНЕ ДЫК УЖО БАХНЕ, ПАВЯЛІКАМУ, РАЗУМЕЕШ? НУ ТЫПУ САМА ПАБАЧЫШ, ЯК ПРЫЦЯГНУ.

ДОБРА, ПАКЕДАВА.

ЧЫКІ-БРЫКІ.




БАХ!




...РОБІЦЦА ВА ЎСХОДНІМ ФІНЧЛІ?


...КАЖУЦЬ, ШТО НА НЕЙКУЮ ЦЁТКУ ДАНЕСЛІ, ШТО ЯНА СПЕРЛА СЛОІК БАБОЎ, ДЫК ЯЕ ПРОСТА ПРЫСТРЭЛІЛІ. І ЦЯПЕР УСЕ НА ВУШАХ...




...ПРОСТА ЯК ЧОРНАСКУРУЮ! ЯНЫ ТАКІ ДАЧАКАЮЦЦА! НЯХАЙ ТОЛЬКІ СЮДЫ СУНУЦ-ЦА, АТРЫМАЮЦЬ ПА САМАЕ, ЗРАЗУМЕЛА?
ПА САМАЕ...




НЕ ВАРТА ЗАНАДТА НАДЗЕ-ЕЦЦА НА МАЎКЛІВУЮ БОЛЬ-ШАСЦЬ, ІВІ, БО МАЎКЛІВАСЦЬ – ДАЛІКАТНАЯ РЭЧ...
АДЗІН ГУЧНЫ ГУК – І ЦІШЫНЕ КАНЕЦ.





АЛЕ ЛЮДЗІ ТАК НАПУЖАНЫ І РАЗ'ЯДНАНЫ.... ХТОСЬЦІ НЕ ВЫТРЫМАЕ І ПАЧНЕ ПРАТЭСТАВАЦЬ, АЛЕ Ж ГЭТА БУДЗЕ ПРОСТА ГОЛАС ГАМАНЛІЎЦА Ў ПУСТЭЛЬНІ...





ГУЧНАСЦЬ ГУКА АДНОСТНА – У ПАРАЎНАННІ З ЦІШЫНЁЙ, ШТО БЫЛА ДА ЯГО. ЧЫМ БОЛЬШ ПОЎНЫМ БЫЛО МАЎЧАННЕ, ТЫМ БОЛЬШЫ ШОК ВЫКЛІКАЕ РАПТОЎНЫ ГРУКАТ.
НАШЫ КІРАЎНІКІ НЕ ЧУЛІ ГОЛАСА НАРОДА ЎЖО ШМАТ ПАКАЛЕННЯЎ, ІВІ.


І ЁН ЗНАЧНА, ЗНАЧНА ГРАМЧЭЙШЫ, ЧЫМ ІМ ХАЦЕЛАСЯ Б ЛІЧЫЦЬ.






6 ЛІСТАПАДА 1998 ГОДА.
ПАЛІЦЭЙСКАЙ МАШЫНЕ «ВІКТАР-ЧАРЛІ-ДЗЕВЯЦЬ» ПАТРАБУЕЦЦА ДАПАМОГА. ЗАСАДА...
НЕ МОЖАМ РУШЫЦЬ УСЛЕД ЗА ІМІ Ў БРЫКСТАН. ПАЛОВЕ РАБЯТ ПАТРЭБНЫ ПРЫВІЎКІ АД ХАЛЕРЫ І...
ТЭРМІНОВЫ ЗАПЫТ...
НАМ ПАТРЭБНЫЯ ЯШЧЭ ДЗВЕ МАШЫНЫ, ПАКУЛЬ МАРАДЗЁРЫ НЕ ДАБРАЛІСЯ ДА ДЭПТФОРДСКІХ БАЛОТАЎ І...


ГРЫН-ПАРК. БОЛЬШАСЦЬ СЯДЗІЦЬ ПА ДАМАХ, АЛЕ Ў РАЁНЕ КІНГС-РОЎД ЗБІРАЕЦЦА НАТОЎП. ДАШЛІЦЕ...
УСЕ МАШЫНЫ Ў РАЁН ТОТЭНХЭМА...
...РАБЯТЫ, ДЗЕЛЯ БОГА, ДАШЛІЦЕ...
ШТО ГЭТА?


РАДЫЁМАГНІТОЛА КАНЦА СЕМІДЗЕСЯТЫХ. МАГЧЫМА ПАДСЛУХАЦЬ ПЕРАМОВЫ ПАЛІЦЭЙСКІХ, НАВАТ КАЛІ НЕ ПРАЦУЕ РАДЫЁВЯШЧАННЕ.
...ПРАТЫСТУЮЦЬ СУПРАЦЬ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ. КАЛІ МЫ ПАЧНЕМ СТРАЛЯЦЬ, ЯНЫ...
...РЭКАМЕНДУЕМ СЛЯЗІСТЫ...
...ВІКТАР-ЧАРЛІ-ДЗЕВЯЦЬ, НА СУВЯЗЬ... ХУТКА ТРЭБА ДАПАМОГА!


СТАРАЯ ФЕРМА БРОДУОТАР. СКАЖЫЦЕ КРЫДЗІ, ТАМ ПАЖАР...
V... УСЕ ГЭТЫЯ БЕСПАРАДКІ... ГЭТА І ЁСЦЬ АНАРХІЯ?
ГЭТА КРАІНА РАБІЯК-ПАЖАДАЕШ?
КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗВАЙЦЕ! ПАЎТАРАЮ: ВІКТАР-ЧАРЛІ-ДЗЕВЯЦЬ...


НЕ. ГЭТА ЎСЯГО ТА КРАІНА БЯРЫШТО-ПАЖАДАЕШ. АНАРХІЯ АЗНАЧАЕ «БЕЗ ЛІДАРА», А НЕ «БЕЗ ПАРАДКУ».
З АНАРХІЯЙ НАСТАЕ ЭПОХА «ORDNUNG», ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ПАРАДКУ САПРАЎДНАГА, ДОБРААХВОТНАГА.


ЭПОХА «ORDNUNG» ПАЧНЕЦЦА, КАЛІ БЕСПАРАДКАВЫ І НЕСКІРАВАНЫ ЦЫКЛ «VERWIRRUNG», СПРАВАЦЫРАВАНЫ СЁННЯШНІМІ ПАДЗЕЯМІ, ПАДЫДЗЕ ДА КАНЦА.
А ГЭТА НЕ АНАРХІЯ, ІВІ.


ГЭТА ХАОС.
ГЛАВА 2
VERWIRRUNG

ЯК БЫЛО Ў ЕЙТСА...
«УСЁ ШЫРЭЙ – КОЛА ЗА КОЛАМ – ХОДЗІЦЬ САКОЛ, НЕ ЧУЕ, ЯК ЯГО СОКАЛЬНІК КЛІЧА; УСЁ БУРЫЦЦА...»
«... АСНОВА РАСХІСТАЛАСЯ».
БУНТ СПЫНЕЦЦА. СУВЯЗЬ АДНАВІЦЦА. НЯХАЙ АНГЛІЯ ТРОХІ ПАБУДЗЕ САМ НА САМ З САБОЙ. ПАСЛЯ ЎСІХ МАІХ ТРУДОЎ Я ЗАСЛУЖЫЎ КРОПЕЛЬКУ ПЯШЧОТЫ.
ЗАЧАРОВАНЫ, Я ГЛЯДЖУ Ў ТВАЕ ВОЧЫ. ЗІЯЮЧЫЯ ПАЛЬЦЫ КРАНАЮЦЦА МАЙГО ТВАРУ.
СА СВАЙГО МІРУ ЧЫСТАЙ МАТЭМАТЫКІ ТЫ КРАНАЕШСЯ ДА МЯНЕ Ў ГЭТЫМ НАДЗЕЙНЫМ І ЗАГРУВАШЧАНЫМ МЕСЦЫ.
ВЕЛЬМІ ХУТКА, ПАЎТАРАЮЧЫСЯ Ў ПАМЯЦІ, ЗМЯНЯЮЦЦА ВОБРАЗЫ ЗА ТВАІМ ШКЛОМ, УСЁ ПАВЯЛІЧВАЮЧЫ ХУТКАСЦЬ, СПРАЧАЮЧЫСЯ З УДАРАМІ МАЙГО СЭРЦА...
ШТО ТАМ: САМАСУД? ЯНЫ ПРАНОСЯЦЦА ТАК ХУТКА... ЛІТАРЫ, СЛОВЫ, НАТОЎП НА СТАДЫЁНЕ, П'ЯНАЯ АЗІЯТКА Ў НАТОЎПЕ...
О БОЖА, Я... ГАРАЦЬ КРАМЫ, ШЫМПАНЗЭ Ў АГОНІ!... ПАЧУЦЦІ, ПУСТЫ ЭКРАН, О БОЖА МОЙ, О МОЙ...
ЛЁС.
О-О-О...
О-О, КАХАННЕ МАЁ, МАЁ...
А-А-А-А-А...
АХ...
«СВЕТ ЗАХЛІСНУЛІ ХВАЛІ БЕЗЗАКОННЯ».

ПРЫМУСОВЫ ПАРАДАК ПАРАДЖАЕ НЕЗАДАВОЛЕННАСЦЬ, МАЦЬ БЕСПА-РАДКУ, ПРАМАЦІ ГІЛЬЯЦІНЫ.

АЎТАРЫТАРНЫЯ ГРАМАДСТВЫ ПАДОБНЫЯ НА ГРУПАВОЕ КАТАННЕ НА КАНЬКАХ. ВЫЧВАРНАЕ, МЕХАНІСТЫЧНА ДАКЛАДНАЕ І, ГАЛОЎНАЕ, НЕНАДЗЕЙНАЕ. ПАД ДАЛІКАТНАЯ КОРКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ БУРБОЛІЦЬ ЛЕДЗЯНЫ ХАОС...

І ЁСЦЬ МЕСЦА, ДЗЕ ЛЁД ПА-ЗДРАДНІЦКУ ТОНКІ.

EXIT

ТЫ АРЫШТАВАНА.

А-А-А!

АЙ НУ ЦЯБЕ, ТЫПА ЖАРТ.

БОЖА, ШТО ВЫ...

СЛУХАЙЦЕ, Я ПРЫНЕСЛА ГРОШЫ. ВЫ ПРЫНЕСЛІ... ТУЮ РЭЧ, ПРА ЯКУЮ Я ПРАСІЛА?

ДЛЯ САМА-АБАРОНЫ?

О ТАК. ГЭТАЯ РЭЧ ЦЯБЕ АБАРОНІЦЬ. ЯШЧЭ ЯК.

ЯК ПАЛЬНЕ КАМУ Ў ПУЗА, ДЫК ПРАМА АДРАЗУ І АБАРАНІЦЬ.

ТЫ, ПАСЛУХАЙ, ВАЛІ ДАДОМУ ПА-ХУТКАМУ, НУ? І КАЛІ СХОПЯЦЬ, ТЫ МЯНЕ ТЫПА ВЕДАЦЬ НЕ ВЕДА-ЕШ, БРЫКІ?

ТАК-ТАК, Я РАЗУМЕЮ. Я АДРАЗУ ДАДОМУ. ВЯЛІКІ ВАМ ДЗЯКУЙ.

ДЗЯКУЙ.

ДЫ КАЛІ ЛАСКА.




ЗДАРОЎ, ПРЫЯЦЕЛЬ.
ВЫРАШЫЎ, ШТО НАМ ПРЫЙШОЎ ЧАС ПАГУТАРЫЦЬ.

МІСТАР КРЫДЗІ?
Я Ж НІЧО НЕ ЗРАБІЎ...
ХА-ХА-ХА! ГЛУПСТВА ЯКОЕ! АРГАНІЗАЦЫЯ ЗЛАЧЫННАЙ ГРУПЫ, УЗБРОЕНАЕ РАБАВАННЕ, ПАРА ЗАБОЙСТВАЎ...
ГЭТА ЎСЁ ТЫ, ПРЫЯЦЕЛЬ.

НЕ, НУ ВЫ Ж ПАМЫЛІЛІСЯ, ЦІ ШО?

ХА-ХА-ХА! ПАМЫЛІЎСЯ!
НЕ, БРАТЭЛА, НІЯКІХ ПАМЫЛАК.

Я ХАЧУ ДАЦЬ ТАБЕ ПРАЦУ.
УСЁ З-ЗА ГЭТЫХ БУНТАЎ, ПРЫЯЦЕЛЬ. У ПАЛЬЦЫ ЗАРАЗ МАЛА ЛЮДЗЕЙ, І Я АТРЫМАЎ ДАЗВАЛЕННЕ НАНЯЦЬ ПАРУ ГРАМІЛАЎ.

ПРОСТА АДШУКАЙ МНЕ ДЗЯСЯТАК ДУМАЛОМАЎ, ГАТОВЫХ ДА НАЧНОЙ ПРАЦЫ, АПЛАТА НАЯЎНЫМІ. ТЫ, КАНЕШНЕ, АТРЫМАЕШ АДСОТАК. НУ, ЯК СКАЖАШ?
НУ, Э-Э...
УГОДА ШТО ТРЭБА, ПРЫЯЦЕЛЬ!

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ НА БОК ЗАКОНА І ПАРАДКА.

КАЛІ ЎЛАДЫ ЎПЕРШЫНЮ ЗАЎВАЖАЮЦЬ ХАОС У СЯБЕ ПАД НАГАМІ, ЯНЫ ПАЧЫНАЮЦЬ ВЫШУКВАЦЬ ХІТРЫЯ ПРЫСТАСАВАННІ, КАБ ЗАХАВАЦЬ СВАОЙ ПАДРОБЛЕНЫ ПАРАДАК...
АЛЕ ГЭТА ЗАЎСЁДЫ ПАРАДАК БЕЗ ЛЮБВІ І СВАБОДЫ, ЯКІ НЕ МОЖА НАДОЎГА АДЦЯГНУЦЬ ПАДЗЕННЕ ІХ МІРА.


УЛАДА ДАЗВАЛЯЕ ГРАМАДЗЯНАМ ГУЛЯЦЬ ТОЛЬКІ ДЗВЕ РОЛІ: КАТА І АХВЯРЫ. ЯНА ПЕРАТВАРАЕ ЛЮДЗЕЙ У МАНЕКЕНАЎ, ЯКІЯ БАЯЦЦА І НЕНАВІДЗЯЦЬ, А КУЛЬТУРА ЛЯЦІЦЬ У ТРЫЗНУ.
УЛАДЫ ПЕРАКРУЧВАЕ ВЫХАВАННЕ ЎЛАСНЫХ ДЗЯЦЕЙ І ПЕРАЎТВАРАЕ СМАГУ ЛЮБВІ Ў ПЕЎНІКАВЫЯ БОЙКІ.

НУ ДОСЫЦЬ, КОНРАД, ДОБРА. ДАЙ МНЕ РУЧНІК.
КАЛІ ГЭТА ЛІДАР ДАЗВОЛІЎ КРЫДЗІ НАЗБІРАЦЬ АТРАД ГАЛАВАРЭЗАЎ?

СЁННЯ ЎВЕЧАРЫ. ТАБЕ ХАЛАТ, ХЭЛЕН?
НЯЎЖО СЬЮЗАН НЕ РАЗУМЕ, ШТО КРЫДЗІ ТОЛЬКІ І ЧАКАЕ, КАЛІ ЁН КАНЧАТКОВА ЗВАР'ЯЦЕЕ, КАБ ЯГО АСАБІСТАЯ АРМІЯ ПАЧАЛА ПЕРАВАОЛЬ?

ВІДАЦЬ, ЛІДАР ПРОСТА ПЕРАТАМІЎСЯ.
ТРАСЦА, КОНРАД... ЁН ВОСЬ-ВОСЬ АШАЛЕЕ, І Я ХАЧУ, КАБ, КАЛІ ГЭТА АДБЫЛАСЯ, У КРЭСЛА НУМАР АДЗІН СЕЎ ТЫ, А НЕ БАНДЗЮГА КРЫДЗІ.

І НАПЭЎНА, ЯК ЗВЫЧАЙНА, УСЁ ПРЫЙДЗЕЦЦА РАБІЦЬ МНЕ АДНОЙ.
ВЕДАЕШ, ТЫ ТАКІ ПАСПЯХОВЫ МАЛАДЫ ЧАЛАВЕК, КОНРАД... КАЛІ Б СВАІМ ПОСПЕХАМ ТЫ НЕ БЫЎ ЦАЛКАМ АБАВЯЗАНЫ МНЕ, Я Б НАВАТ МАГЛА ЗАХАПІЦЦА ТАБОЙ.

ШТО Ж, РАНІЦАЙ У МЯНЕ БУДЗЕ ШМАТ СПРАЎ, ТАМУ Я НАКІРОЎВАЮСЯ Ў ЛОЖАК. І ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, КАЛІ ТЫ ПРЫЙДЗЕШ, Я БУДУ ЎЖО СПАЦЬ.
ТАБЕ Ж СВЯТЛО ТУТ НЕ ПАТРЭБНА, ТАК?


УЛАДА РУШЫЦЦА, І ШЧЫЛІНЫ ПРАХОДЗЯЦЬ ПРАЗ СПАЛЬНІ, ЗАЛЫ ПАСЕДЖАННЯЎ, ЦЭРКВЫ І ШКОЛЫ. УСЁ ДРЭННА КІРУЕЦЦА.
РОЎНАСЦЬ І СВАБОДА – ГЭТА НЕ РАСКОША, ЯКОЙ З ЛЁГКАСЦЮ МОЖНА АХВЯРАВАЦЬ. БЕЗ ІХ ПАРАДАК У ЛЮБЫ МОМАНТ МОЖА РУШЫЦЦА Ў НЕАБСЯЖНУЮ БЕЗДАНЬ.

V, ПАЧАКАЙ-КА ХВІЛІНКУ... МЫ ТУТ РАНЕЙ НЕ БЫЛІ. КУДЫ МЫ ІДЗЕМ? У ЦЯБЕ ШТОСЬЦІ ПРЫХАВАНА ТУТ, УНІЗЕ?

V?

V, АДКАЖЫ МНЕ...

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ГЭТА ЛОНДАН 648-27-32...

ГЭТА АЎТААДКАЗНІК ЭРЫКА ФІНЧА.

МЯНЕ ЗАРАЗ НЯМА, АЛЕ КАЛІ ВЫ ПАВЕДАМІЦЕ СВАЁ ІМЯ І НУМАР ТЭЛЕФОНА ПАСЛЯ ГУДКА, Я АБАВЯЗКОВА ПЕРАТЭЛЮ.

АЛО?

О... АЛО, ГЭТА ЗНОЎ ДАМІНІК...

SUPAHEAT

OFF ON

ПАСЛУХАЙЦЕ, ПРОСТА... ЗВЯЖЫЦЕСЯ СА МНОЙ, КАЛІ ЛАСКА. У НАС ПРАБЛЕМЫ З МІСТАРАМ СЬЮЗЕНАМ І МІСТАРАМ КРЫДЗІ. РАЗМОВА НЕ ПА ТЭЛЕФОНЕ.

УСЁ КАЦІЦЦА ДА ЧОРТА, МІСТАР ФІНЧ. Я НЕ ВЕДАЮ, ШТО РАБІЦЬ.

НУ Я... ВОСЬ І ЎСЁ, НАПЭЎНА.

ПАКУЛЬ.

БУДЗЬЦЕ АСЦЯРОЖНЫ.

V?

НУ ДАВАЙ, Я Ж ЧАКАЮ АДКАЗУ. ДЗЕ...

ГЭТА МАЁ ТАЯМНІЧАЕ ЛЮБОЎНАЕ ГНЯЗДЗЕЧКА, ІВІ.

Я ПРЫВЯЗУ ЦЯБЕ НА СУСТРЭЧУ З МАЁЙ КАХАНАЙ.


З ТВАЁЙ... ШТО?
ГЭТА ЗАБЛЫТАННАЯ І СУМНАЯ ГІСТОРЫЯ ПРА РАЗБІТАЕ СЭРЦА І ЗДРАДУ.
НЕ Я БЫЎ ВІНАВАТЫМ УСІХ БЕД. МАЁЙ КАХАНАЙ БЫЛА ФЕМІДА. НАТХНЁНЫ ЯЕ ХАРАСТВОМ, ЯЕ ШЧЫРАСЦЮ, Я ЎШАНОЎВАЎ ЯЕ.


ДАТУЛЬ, ПАКУЛЬ У МЯНЕ ЗА СПІНОЙ ЯНА НЕ АДДАЛАСЯ ЧАЛАВЕКУ, ЯКІ ГВАЛТАВАЎ ЯЕ І БІЎ, ЖОРСТКАМУ ГНЮСУ, ЯКІ НЕ ГРЭБАВАЎ СПАЛЬВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ.
ЁН ЗМЯНІЎ ЯЕ. ЯНА ПАЛЮБІЛА БІЗУН, ЛАНЦУГ, СКУРАНУЮ БЯЛІЗНУ.


ФЕМІДЫ, ЯКУЮ Я КАХАЎ, БОЛЬШ НЯМА; ТОЙ, У ЯКОЙ БЫЛІ ТАКІЯ ДОБРЫЯ ВОЧЫ, ЯКАЯ РУХАЛАСЯ АСЦЯРОЖНА, ДРОБНЫМІ КРОКАМІ...
ЦЯПЕР ЯНА ЗЛАСЛІВА ГЛЯДЗІЦЬ СКРОЗЬ ПРАРЭЗЫ ПРЫЦЭЛАЎ, І ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ КУРЧАЦЦА ПАД ЯЕ ЖАЛЕЗНАЙ ПЯТОЙ.


УЯВІ МАЕ ПАЧУЦЦІ, КАЛІ Я ДАВЕДАЎСЯ ПРА ЯЕ ЗДРАДУ...
МОЙ ГНЕЎ І СОРАМ ПРЫ ДУМЦЫ АБ ТЫМ, ЯК ЯНЫ КПІЛІ НАД УСІМ, ШТО Я ЛЮБІЎ, – МАЯ ФЕМІДА І ЯЕ БРУДКАЯ БЫДЛА, КУЛЯЮЧЫСЯ НА СКРЫВАЎЛЕНЫХ ПРАСЦІНАХ.


У КАХАННІ, У БАІ ЎСЕ СРОДКІ ДОБРЫЯ, І Я ЗЛОДЗЕЮ ВЫРАШЫЎ АДПОМСЦІЦЬ.
НЯХАЙ Я РАГАТЫ, АЛЕ КАЛІ ЗАХАЧУ, ЯМУ МАНЕТАЙ ТОЙ ЖА АДПЛАЧУ.


БО МОЙ СУПЕРНІК, ЖАЛАСНЫ І ГАРБАТЫ, МІЖ ІНШЫМ САМ БЫЎ ШЧАСЛІВА ЖАНАТЫ.
РАСПУСНІК, ЗЛОДЗЕЙ! АТРЫМАЕ ЁН СПАЎНА, ДАВЕДАЎШЫСЯ, ШТО СПІЦЬ СА МНОЙ...


...ЯГО ЖАНА.

NEW
SCOTLAND
YARD

НОС. 7 ЛІСТАПАДА 1998 ГОДА.

«РУЖЫ ПУНСАВЕЮЦЬ У ЗАХОДНІМ ДЫМУ, УСЁ ВЕРАГОДНА, НЕ ВЕР НІЧАМУ».

ПАДОБНА НА ЛЮБОЎНЫЯ НАТАТКІ. АД КАГО ГЭТА?

ДАВЕДВАЦЦА – ГЭТА ВАША СПРАВА.

МАЕ ГРАМАДСКІЯ ДРУЖЫННІКІ ЗНАЙШЛІ ІХ СЁННЯ РАНІЦАЙ У САМЫХ РОЗНЫХ МЕСЦАХ.

«ЛЮБЛЮ Я ВЕЦЕР, ДОЖДЖ І МЕСЯЦ, І ЗОРАК ЗЗЯННЕ Ў ВЫШЫНЕ».

РАШАЙЦЕ З ГЭТЫМ ПСІХАМ. КРАІНА КАЦІЦЦА Ў ТАРАТЫМ. ВЕДАЕШ, ШТО Ў МАНЧЭСТЫРЫ ПАЧАЛІСЯ ГАЛОДНЫЯ БУНТЫ? З-ЗА ПРАКЛЯТАЙ КАМПУТАРНАЯ ПАМЫЛКІ!

«СКРОЗЬ ДУБЦЫ РАШОТКІ ВАС ПАЦАЛАВАЦЬ ВЕЛЬМІ ЖАДАЛАСЯ Б МНЕ».

ШТО ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ?

ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ НЕПРЫЕМНАСЦІ, СЫНОК. У ТАКІ ЧАС ТРЭБА ТРЫМАЦЦА БЛІЖЭЙ ДА САПРАЎДНЫХ СЯБРОЎ.

ВОЗЬМЕМ, ДЛЯ ПРЫКЛАДУ, ЦЯБЕ. ПРАЦУЕШ ЗАГАДЧЫКАМ НОСА, З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК ЛЫСЫ ЗНІК. ХІСТКАЕ СТАНОВІШЧА. ТУТ УСЁ МОЖА ЗМЯНІЦЦА ХОЦЬ ГЭТАЙ НОЧЧУ.

ГЭТАЙ НОЧЧУ.

КАНЕШНЕ, ЛІДАР У НАС ВЫДАТНЫ, АЛЕ КАЛІ ШТОСЬЦІ ЗДАРЫЦЦА, ХТО ЗОЙМЕ ЯГО МЕСЦА? ДУМАЎ АБ ГЭТЫМ КАЛІ-НЕБУДЗЬ?

ВЕДАЮ, З ФІНЧАМ МЫ НІКОЛІ НЕ СЯБРАВАЛІ, АЛЕ З ТАБОЙ МАГЛІ Б.

У БУДУЧЫМ НАШЫЯ ДЭПАРТАМЕНТЫ МАГЛІ Б БОЛЬШ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ.

«ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, АЛЕ ЯК ЛЮБІЦЬ ЗАКОН, КАЛІ ЯК САМАДАЙКА ПРАДАЕЦЦА ЁН».


«АБ ІМ ДАРЭМНА ПРАВЕДНІК УЗДЫХАЕ; А ЗЛОДЗЕЙ ЯГО, НАСЫЦІЎШЫСЯ, КІДАЕ».

ХА, СМЕШНА.

ВЫ САМІ ДЗВЕРЫ ЗНОЙДЗЕЦЕ?

ГЛАВА 3

VАЛЕНТЫКІ



ТАБЕ ШО, РАССТРЭЛЫ НЕ ПАДАБАЮЦЦА?

НУ ДОБРА, ЗАПХНІ ЯЕ Ў КУЗАЎ ДА ІНШЫХ. НЕ, ТЫ ШО, ТЫПА, НЕ БАЧЫШ, АБЕД У МЯНЕ.

ПРЫВЕТ, ПРЫЯЦЕЛЬ, ВЕСЬ У СПРАВАХ?

ДЫ НУ, ДРОБЯЗІ. АТРЫМЛІВАЮ ГРОШЫ ЗА ЛАХОЎ, ДЫ ЗА ТОЕ, КАБ РАБІЦЬ ІХ ДЗЕЎКАМ АСАБІСТЫ АГЛЯД.

ВЫ, ХЛОПЦЫ, МУДРАГЕЛІСТЫЯ ЗАНАДТА, САМАЕ САЛОДКАЕ САБЕ ЗАБІРАЕЦЕ.

ХА-ХА, НУ ГЛЯДЗІ, ПРАВІЛЬНА ВЫЦЯГНЕШ КАРТУ, ТВАЕ РАБЯТЫ БЕЗ ПРАЦЫ НЕ ЗАСТАНУЦЦА.

МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ТВОЙ СТЫЛЬ, У ТАКІ НЕБЯСПЕЧНЫ ЧАС НАРОДНАЯ ЛЮТВА ЗАЎСЁДЫ СПАТРЭБІЦЦА.

СКАЖАМ, Я МОГ БЫ ПРАПАНАВАЦЬ ЧАТЫРЫ СОТНІ Ў ТЫДЗЕНЬ.

АЛЕ ЗА ГЭТА МНЕ ПАТРЭБНА АБСАЛЮТНАЯ АДДАНАСЦЬ, КАЛІ ЗДАРЫЦЦА НЕПРАДУГЛЕДЖАНАЕ, РАЗУМЕЕШ, ПРА ШТО Я?

ТЫПА Я ПРЫКІДВАЮ.

НУ ШТО Ж, ПАДУМАЙ. Я АБЯЦАЮ ВЫДАТНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ Ў ЛЮБОЙ СТРУКТУРЫ, ЯКАЯ МОЖА СФАРМІРАВАЦЦА...

КАЛІ ЗДАРЫЦЦА НЕПРАДУГЛЕДЖАНАЕ.

РАЗУМЕЕШ, СТАНОВІШЧА НЕНАДЗЕЙНАЕ. У ЛІВЕРПУЛЕ ЎЖО БЫЛІ ПЕРАБОІ З ЭНЕРГІЯЙ. КАЛІ ГЭТА ЗДАРЫЦЦА ТУТ...

ОЙ, БРАТЭЛА, НЕ ТУРБУЙСЯ, ЧАТЫРЫ СОТНІ – І Я ТВОЙ.

А ЗАРАЗ, ПРАБАЧ, ЧАС ІСЦІ.

ЯК, УЖО ЎХОДЗІШ? СПАДЗЯЮСЯ, НІ З КІМ ІНШЫМ ТЫ СПРАЎ НЕ ВЯДЗЕШ?

НЕ-А, ТАК, АДНА КІСКА.

СЛУХАЙ, ТУТ ЯШЧЭ ГЭТЫЯ ЛІСТЫ. ТЫ Б УЗЯЎ, ЗІРНУЎ.

ПАКУЛЬ, ПАКУЛЬ, АГА?






ПРЫВІТАННЕ. ЦЫДУЛКУ АТРЫМАЎ, АГА. ВЫБАЧАЙ-ЦЕ, СПАЗНІЎСЯ, І...
У НАСТУПНЫ РАЗ БУДЗЬЦЕ ПУНКТУАЛЬ-НЫМ. Я НЕ ЛЮБЛЮ ЧАКАЦЬ.
ВЫ ВЕДАЕЦЕ, ХТО Я?
НУ ТАК, ВЫ ГАСПА-ДЫНЯ ГЭТАГА, ЯКІ Ў ВОКЕ ГАЛОЎНЫ.
А ВЫ ЎЗНАЧАЛІВАЕЦЕ НАРОДНУЮ ЛЮТВУ КРЫДЗІ.
ВЫ ВЕДАЕЦЕ, ШТО ЁН ПРАНУЕ ПЕРАВА-РОТ? ЁН ХОЧА БЫЦЬ ЛІДАРАМ.
ДА ВЫ ШО, ДЫ НУ, Я НАОГУЛ НЕ Ў ТЭМЕ...
НЕ СТРОЙЦЕ ДУРНЯ. ГЭТА ЯК БІЗНЭС-ПЛАН: КРЫДЗІ ХОЧА СТАЦЬ ЛІДАРАМ. А Я ХАЧУ, КАБ ЛІДАРАМ СТАЎ КОНРАД.
КОЛЬКІ ЁН ВАМ ПЛОЦІЦЬ?


НУ ТЫПА Я ЗАРАЗ ПЯЦЬ СОТНЯЎ МАЮ...
САПРАЎДЫ? А Я ДУМАЛА, МАКСІМУМ ЧАТЫРЫ.
Я ГАТОВА ПРАПАНАВАЦЬ ШЭСЦЬ ПЛЮС ПРЭМІЮ ВА-ШЫМ УРВІЦЕЛЯМ.


НУ ТЫПА ФАНА. І ШО Я ЗА ГЭТА ПАВІНЕН РАБІЦЬ?
ВЫ БУДЗЕЦЕ ПРАЦЯГ-ВАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА КРЫДЗІ, АТРЫМЛІВАЦЬ АД ЯГО ГРОШЫ, АЛЕ ДАКЛАДВАЦЬ МНЕ...
А КАЛІ ПРЫЙДЗЕ ЧАС, УЗГАДАЕЦЕ, ХТО ВАМ ПЛАЦІЦЬ НА САМОЙ СПРАВЕ.


СЛУХАЙЦЕ, Я НА ПАЛЬЦЭЙСКІХ НЕ КА-КАЮ. КРЫДЗІ-ТА Ў ІХ ГАЛОЎНЫ...
ХАРПЕР, РАБІЦЕ, ШТО Я СКАЖУ, І ХУТ-КА ВЫ БУДЗЕЦЕ ТАМ ГАЛОЎНЫМ.
НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ ЗА КРЫДЗІ. ЁН ЛІПІЦЬ НА ПАВУЦІНЦЫ...


ПАМЯТАЕЦЕ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ З ЯГО ПАПЯРЭДНІКАМ?



ДЭРЭК...

ДЭРЭК, ТЫ БУЎ У ДРЭННЫМ НАСТРОІ, А ПОТЫМ ПОМЕР, ВОСЬ І ЎСЁ.

ТЫ ПАМЁР, І Я НЕ МАГУ СПАЦЬ ПА НАЧАХ.

ТЫ ПАМЁР І ПАКІНУЎ МЯНЕ ГОЛАЙ ПЕРАД НЕЗНАЁМЦАМІ.

ДЭРЭК, ПАМЯТАЕШ, КАЛІ МЫ АЖАНІЛІСЯ, Я ПРАЦАВАЛА Ў БАНКУ, А ТЫ Ў СТРАХАВОЙ КАМПАНІІ. МЫ ЗБІРАЛІСЯ НАБЫЦЬ ДОМ У СУРЭЕ, НАВАТ ЗАВЕСЦІ ДЗЯЦЕЙ. ГЭТА БЫЛО Ў 1987-М.

ЯК РАЗ ПЕРАД ВАЙНОЙ.

А ПОТЫМ, У 1992-М ТЫ ЎСТУПІЎ У ПАРТЫЮ.

МІСІС РАНА, СУСЕДКА, УСЮ ВАЙНУ ДАПАМАГАЛА НАМ З ЕЖАЙ. ПОТЫМ ЯНЫ ЎВЕЗЛІ ЯЕ І ДЗЯЦЕЙ У РОЗНЫХ МАШЫНАХ. МЫ НЕ ПЕРАШКАДЖАЛІ.

...А ЦЯПЕР ТЫ ПОМЕР, І Я ХАЖУ АДНА ПРАЗ КВАРТАЛЫ, ЯКІЯ БУНТУЮЦЬ, МІМА МАРАДЗЁРАЎ, САЛДАТ І ПЫЛАЮЧЫХ БУДЫНКАЎ...

ЦЯПЕР ТЫ ПОМЕР, І Я ПОЎЗАЮ ЯК ЖЫВЁЛІНА ПАДСТАЎЛЯЮ АЗАДАК УСЯМУ СВЕТУ.


ЦЯПЕР ТЫ ПОМЕР, І Я НЕ МАГУ СПАЦЬ, БО БАЮСЯ, ПЛАЧУ, НЕНАВІДЖУ, ДУМАЮ: «ХТО ЗРАБІЎ ГЭТА СА МНОЙ?»

НЕ МАГУ СПАЦЬ, БО ПРАГНУ ПРАВАСУДДЗЯ, ХАЧУ, КАБ УВЕСЬ СВЕТ ДАВЕДАЎСЯ АБ ГЭТАЙ НЕСПРАВЯДЛІВАСЦІ...

НЕ МАГУ СПАЦЬ З-ЗА ПІСТАЛЕТА ПАД ПАДУШКАЙ.

НУ ДЗЯКУЙ.
СЛУХАЙЦЕ, ТУТ ЖА ПЕРАНАЧАВАЦЬ НЕДЗЕ. ГАСЦІНІЦЫ ПАЗАЧЫНЯЛІ. ВЫ ШТО, ПАЛАТКУ З САБОЙ УЗЯЛІ ЦІ ШТОСЬЦІ ТАКОЕ?
ТАК.
ШТОСЬЦІ ТАКОЕ.
ГЭТА ДЗЕЛЯ ЦЯБЕ, ДЭЛІЯ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ДЗЕЛЯ ЦЯБЕ.
Я БЫЎ ШЧАСЛІВЫ З ТАБОЙ. ТАК, ТАК, Я БЫЎ ШЧАСЛІВЫ І З СІНЦІЯЙ І МАЛЕНКІМ ПОЛАМ, АЛЕ ГЭТА БЫЛО ДЗЕСЯЦЬ ГОД ТАМУ.
З ГЭТЫМ Я ЎЖО ЗЛАДЗІЎ.
А ГЭТА Я РАБЛЮ ДЛЯ ЦЯБЕ, ДЭЛІЯ.
ДЛЯ ДЗЯРЖАВЫ ТАК САМА, КАНЕШНЕ, І ДЛЯ СЯБЕ, ЯК БЕЗ ГЭТАГА, АЛЕ ЎСЁ Ж ТАКІ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ – ДЛЯ ЦЯБЕ.
ТЫ – ПРЫЧЫНА ТАГО, ШТО Я ПРЫЙШОЎ СЮДЫ.
ТУТ УСЁ ПАЧАЛОСЯ.
ТУТ ГЭТА І СКОНЧЫЦЦА.
ЛАРКХІЛЛ ЛАГЕР ПЕРАМЕШЧАНЫХ АСОБАЎ


V?
ТЫ АМАЛЬ СКОНЧЫЎ, ТАК?
САМА ПАГЛЯДЗІ.



УСЕ ДЭТАЛІ РЭБУСА РАСКЛАДЗЕНЫ ПЕРАДА МНОЮ.
КАЛІ ЁН БУДЗЕ СКЛАДЗЕНЫ, ВЫПАДКОВЫ НАЗІРАЛЬНІК САМ ЗМОЖА РАЗГАДАЦЬ ЯГО ЗАДУМУ.


АЛЕ СКАЗАЦЬ, ШТО Я «АМАЛЬ СКОНЧЫЎ»?
ТАК.
ТАК, ВІДАЦЬ, ШТО ТАК.


РАЗГЛЯДЗЕЦЬ ІСЦІНУ ЎСЁ ЯШЧЭ ЦЯЖКА, БО ЯНА ЗАНАДТА ДОБРА ЗАМАСКІРАВАНА, АЛЕ ЗАРАЗ ВЫЦІНАНКА, ЯКУЮ Я ЗУДУМАЎ ДАЎНО, УЖО БАЧНА.
НЯЎЖО ЯНА НЕ ПРЫГОЖА? ТЫ БАЧЫШ, ЯКАЯ ЯНА ВЫТАНЧАНАЯ, ПРОСТАЯ І СТРОГАЯ?


ЯК ДЗІЎНА, ШТО ПАСЛЯ ТАКОЙ ДОЎГАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДАСТАТКОВА ТОЛЬКІ ЛЁККАГА ДОТЫКА, КАБ ПАЧАЎСЯ НЯЎМОЛЬНЫ, ЗАХАПЛЯЛЬНЫ ДУХ РУХ.
АДЗІН ДОТЫК, НЕ БОЛЬШ...


І ЎСЁ СТАНОВІЦЦА НА МЕСЦА.


ДАМІНОШКІ, У АДРОЗНЕННІ АД НАС, НЕ МОГУЦЬ ПАЗБЕГНУЦЬ НАДЫХОДЗЯЧАГА НЯШЧАСЦЯ: ІХ СПАКОЙНАЯ, ЗАКОНАПАСЛУХМЯНАЯ ЧАРАДА, ГАТОВАЯ РАЗРАДЗІЦЦА КАТАСТРОФАЙ, НЕ АДЧУВАЕ НАБЛІЖЭННЯ ХВАЛІ, ЯКУЮ ПРЫГАТАВАЛА ДЛЯ ІХ ЗЛАДЗЮГА-ЛЁС.
І ЯНЫ - ТЫЯ, ХТО БОЛЬШ УСІХ ПАКУТУЕ, - РАЗУМЕЮЦЬ МЕНЬШ ІНШЫХ.



КАЛІ Ж РАЗУМЕННЕ ЎСЁ Ж ТАКІ ПРЫЙДЗЕ ДА ІХ, ГЭТА НЕПАЗБЕЖНА АДБУДЗЕЦЦА ВЕЛЬМІ ПОЗНА.
У цябе ёсць
лялька завадная,
што жыве з табой,
як жана.
Я ўсе дзённікі
яе чытаю:
яна іхэ,
бышцам табе вярна!


ЗРАЗУМЕЛА, ЯНЫ НІ АБ ЧЫМ НЕ ПАДАЗРАЮЦЬ, ПАКУЛЬ У НЕЙКІ ЖУДАСНЫ МОМАНТ ІХ НЕ ПАДХОПЛІВАЕ НЕЙКАЯ СІЛА, І Ў АПОШНЮЮ СЕКУНДУ ЯНЫ СПРАБУЮЦЬ ПАЗБЕГНУЦЬ БЯДЫ, БЯГУЦЬ ДА РАТАВАННЯ...


АЛЕ НА САМОЙ СПРАВЕ ЯНЫ НЕ БЯГУЦЬ...
ЯНЫ ПАДАЮЦЬ.


ВОСЬ ТАК.
БЕДНЫЯ ДРАБІНКІ.
ПАГЛЯДЗІ НА ІХ. ЯК ЯНЫ СТАЦЬ З НУМАРАМІ НА СПІНЦЫ, НЮРНБЕРГ У МІНІЯЦЮРЫ, ЧАРГА РАСФАРБАВАНЫХ ДРАЎЛЯНЫХ ЧАЛАВЕЧКАЎ...


БЕДНЫЯ ДАМІНОШКІ.
ВАШУ МАЛЕНЬКУЮ ІМПЕРЫЮ БУДАВАЛІ ТАК ДОЎГА, А ЦЯПЕР – АДЗІН ДОТЫК ПАЛЬЦАЎ ГІСТОРЫІ...


...І ЯНА ЗРЫНУЛА.




ЛІДАР...


Я ВЕДАЮ.
ТЭРАРЫСТ... Я ВЕДАЮ, ЯК ЁН ГЭТА РОБІЦЬ.



ПА-ПЕРШАЕ, ЁН УСЁ ВЕДАЕ ПРА НАС І НАШУ СІСТЭМУ.


ПА-ДРУГОЕ, СЁННЯ РАНІЦАЙ МЫ ЗНАЙШЛІ Ў МНОГІХ ЛЮДЗЕЙ СУПРАЦЬУРАДАВЫЯ ВЕРШЫКІ, ПРЫЧЫМ ЯНЫ СЦВЯРДЖАЛІ, ШТО АТРЫМАЛІ ІХ ПА ПОШЦЕ.
ЛІДАР, ЁН ПРЫМУШАЕ НАС ДАСТАЎЛЯЦЬ ДЛЯ ЯГО ЎЛЁТКІ! ЯК?



ЯК ЁН СПРАВАЦЫРАВАЎ ПЕРАБОІ ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ Ў МЕРСІСАЙДЗЕ І ХАРЧОВЫЯ БУНТЫ Ў БІРМІНГЕМЕ? Я ВЕДАЮ, ЛІДАР, ГЭТА НЕМАГЧЫМА, АЛЕ АДКАЗ МОЖА БЫЦЬ ТОЛЬКІ АДЗІН.
У ЯГО ЁСЦЬ ДОСТУП ДА ЛЁСУ.
У ЯГО БЫЎ ДОСТУП ДА ЛЁСУ З САМАГА ПАЧАТКУ.


МЕНАВІТА ТАК ЁН...
ЛІДАР?
ШТО?























Photo: Mitch Jenkins